**Упраўленне па адукацыі**
**адміністрацыі Маскоўскага раёна г.Брэста**
**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа №7 г.Брэста”**

# ВЕРНАСЦЬ ПРАФЕСІЙНАМУ АБАВЯЗКУ І ГЕРАІЧНАЕ ЗМАГАННЕ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ НА ПРЫКЛАДЗЕ ВОБРАЗА НАСТАЎНІКА АЛЕСЯ МАРОЗА Ў АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “АБЕЛІСК” З АПОРАЙ НА ГІСТОРЫІ РЭАЛЬНЫХ ЛЮДЗЕЙ П.М.МАШЭРАВА І М.А.ПАШКЕВІЧА

Бурава Вераніка Андрэеўна
Вучаніца IX “Г” класа
Ціхановіч Віялета Валянцінаўна
Вучаніца IX “Г” класа

Кіраўнік Салей Святлана Васільеўна
настаўнік беларускай мовы і літаратуры

2022

Змест

УВОДЗІНЫ …..……………………………………………………3

ГЛАВА І ДУХОЎНАСЦЬ І ГЕРАІЗМ У ВОБРАЗЕ НАСТАЎНІКА АЛЕСЯ МАРОЗА З АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “АБЕЛІСК”……………………………………………………......4

ГЛАВА ІІ ГЕРАІЧНАЕ ЗМАГАННЕ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ І ПРАФЕСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ П.М. МАШЭРАВА…………………………………………………..……7

2.1. Вытокі жыццялюбства і натхнёнасці П.М.Машэрава………7

2.2. Настаўніцкая дзейнасць П.М.Машэрава…………………….8

2.3.Выпрабаванне вайной………………………………..……...9

ГЛАВА ІІІ ЕДНАСЦЬ ЖЫЦЦЁВЫХ ПРЫНЦЫПАЎ АЛЕСЯ МАРОЗА З АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “АБЕЛІСК” І М.А. ПАШКЕВІЧА……………… …………..……………………11

ВЫСНОВЫ …………… ………………………………………13

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

## УВОДЗІНЫ

> І сіла герояў Быкава, і ўласцівае ім пачуццё адказнасці, і іх самаахвярнасць – за ўсім гэтым заўсёды паўстае народ на вайне. Праз іх лёс мы бачым і веліч народа, і яго трагедыю.
>
> (Л. Лазараў)

У кожнага чалавека свой адметны лёс і свой непаўторны шлях. І ў той жа час – гэта лёс і шлях народа, сынам якога ён з'яўляецца.

Жыццё чалавека – гэта вялікі цуд, самы непаўторны дар прыроды, і ім трэба бясконца даражыць, значыць, – трэба змагацца супраць замаху на жыццё чалавека і чалавецтва.

У кожнага часу ёсць свая памяць – гісторыя. І таму чалавецтва ніколі не забывае пра трагедыі, якія адбываюцца ў розныя эпохі, у тым ліку – войны, якія забіраюць мільёны жыццяў. Адной з такіх трагедый была Вялікая Айчынная вайна. Адным з пісьменнікаў,што прысвяцілі сваю творчасць расказу пра тое, "як нялёгка давалася нам перамога", які гераізм праяўлялі нашы людзі, як самаахвярна набліжалі яны шчаслівы дзень вызвалення Радзімы, быў В.Быкаў.

У 1971г. з-пад пяра В. Быкава выйшла ў свет аповесць "Абеліск". Праз маральнае аблічча галоўнага героя Мароза пісьменнік узняў надзвычай актуальную заўсёды, у тым ліку і сёння, праблему грамадскай ролі настаўніка, разуменне высокай настаўніцкай місіі: рыхтаваць не толькі выдатнікаў вучобы, а найперш годных людзей, патрыётаў, выхоўваць вучняў яшчэ і сваім прыкладам, як гэта рабіў настаўнік Мароз. Ад мэты фарміраваць вучня як сумленнага чалавека настаўнік не адмовіўся і ў гады вайны.

**Аб'ектам даследавання** дадзенай працы з'яўляецца вобраз Алеся Мароза ў аповесці В. Быкава "Абеліск" з апорай на гісторыі рэальных людзей П.М.Машэрава і М.А.Пашкевіча

**Мэта працы:** выявіць своеасаблівасць вобраза Алеся Мароза і даследаваць дзеянні П.М.Машэрава ў час Вялікай Айчыннай вайны і М.А.Пашкевіча ў пасляваенны час.

**Задачы даследавання:**

- пазнаёміцца з тэарытычным матэрыялам пра дзейнасць П.М.Машэрава ў час Вялікай Айчыннай вайны і М.А.Пашкевіча ў пасляваенны час;
- выхоўваць неабходнасць разумення захавання памяці ахвяр генацыду;
- садзейнічаць выхаванню павагі да настаўніцкай працы

**Гіпотэза даследавання:** калі ў школе будуць знаёміцца з літаратурнымі творамі пра Вялікую Айчынную вайну, то вучні дастаткова будуць ведаць пра гэтыя падзеі, ганарыцца сваімі землякамі, навучацца ўшаноўваць памяць герояў.

# ГЛАВА І ДУХОЎНАСЦЬ І ГЕРАІЗМ У ВОБРАЗЕ НАСТАЎНІКА АЛЕСЯ МАРОЗА З АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА “АБЕЛІСК”

Галоўным героем аповесці В. Быкава “Абеліск” з’яўляецца вясковы настаўнік Алесь Іванавіч Мароз, які не абмяжоўвае свой кругагляд прафесійнымі нормамі, а “самы найпершы настаўніцкі абавязак бачыў у тым, каб … рабіць не выдатнікаў вучобы, не паслухмяных зубрылак, найперш - чалавекаў”.

Знешнасць героя аўтар паказвае чытачу праз успрыманне тагачаснага загадчыка раяна Ткачука, які першы раз сустракаецца з Марозам, калі прыехаў па скарзе пані Ядзі ( старой настаўніцы выхавання “самага гжэчнага”), якая даводзіла да “пана шэфа”, што “гэты Мароз не падтрымлівае дысцыпліны, як роўны паводзіць сябе з вучнямі, вучыць без неабходнай строгасці, не выконвае наркаматаўскіх праграм”. Ткачук застае Мароза за незвычайнай для загадчыка школы справай: разам з вучнямі той нарыхтоўвае дровы для школы. Ткачук так гаворыць пра яго: “…кульгае. Адна нага неяк вывернута ўбок і быццам не разгінаецца, таму ён здорава прыпадае на яе… А так на выгляд плячысты, ладны з твару, позірк смелы, упэўнены… Прадстаўляецца… Руку паціскае так, што адразу зразумела: дужы хлопец. Далонь шурпатая, цвёрдая…” Жыў Мароз сціпла ў баковачцы пры школе, спаў на раскошнай канапе ў стылі барка, але накрываўся паліто, харчаваўся бульбачкай, але Ткачука частаваў каўбасой і прастаквашай. Пачастунак прынесла маці вучня, калі даведалася, што ў настаўніка важны госць. У час вячэры і знаёмства Ткачук адзначыў, што Мароз “ глядзеў шырай і, можа, далей, чым гэта прынята глядзець, абмяжоўваючы свой кругагляд прафесійнымі нормамі.” Мароз выхоўваў сваіх вучняў уласным прыкладам, высакароднымі ўчынкамі, клопатам пра іх лёс. Калі Паўліка Міклашэвіча жорстка збіваў бацька, а мачысе не было да пасынка ніякай справы, настаўнік даў прытулак хлопцу у сваёй бакоўцы пры школе. Калі бацьеа паспрабаваў вярнуць яго дадому, не пабаяўся непрыемнасцей,уступіўся за хлопчыка, дабіўся праз суд, каб яго перадалі ў дзетдом, а з выкананнем гэтага рашэння не спяшаўся. У цёмныя зімовыя вечары праводзіў Ленку Удодаву з Вольгай дадому, “бо малыя, а ім праз лес ісці трэба”. Ён купіў дзяўчынкам чаравікі, каб дзеці ўдавы маглі раведваць школу і вучыцца.

Цімафей Цітавіч Ткачук звяртае ўвагу на тое, што настаўнікі, прыязджаючы ў раяна, “скардзіліся на ўмовы, прасіліў то парты, то дошкі, то дровы, то газу, то паперу”, а Мароз больш за ўсё клапаціўся пра кнігі. Ён прыахвоціў да чытання дзяцей, і, калі не мог атрымаць кніг, здабываў іх сам. У панскім маёнтку знайшоў скрыню кніг, дзе быў збор твораў Л. Талстога. Калі настаўнік пераносіў кнігі праз раку, праваліўся і захварэў на запаленне лёгкіх.ён месяц хварэў, а дзеці ўсё роўна прыходзілі ў школу і слухалі пра Андрэя Балконскага з вялікай цікавасцю. Вучні Алеся Іванавіча ставілі “Паўлінку”, спявалі, дэкламавалі. І рабіў ён усё гэта “не за грошы, не па абавязку – так проста. Па прызванню вясковага настаўніка”.

Станаўленню новага жыцця перашкодзіла вайна. Як ні рыхтаваліся да яе, як ні чакалі, а абрынулася яна як гром з яснага неба. Акупацыя стала суровым выпрабаваннем для людзей. Яны ўзяліся за зброю: адны для абароны Радзімы, другія падаліся служыць у паліцыю. Алеся Іванавіча Мароза Ткачук знайшоў у школе. "**Не будзем вучыць мы – будуць абалваньваць яны. А я не затым тут два гады ачалавечваў гэтых рабят, каб іх расчалавечылі. Я за іх яшчэ пазмагаюся. Наколькі змагу, вядома.**" Праз сваю кульгавую нагу настаўнік не мог пайсці ў партызаны, але быў сувязным, дапамагаў збіраць зброю народным мсціўцам, слухаў радыё і перадаваў звесткі Савінфармбюро, з усіх сіл імкнуўся стрымаць неабдуманую рызыку сваіх вучняў. Але аднойчы фашысты арыштавалі яго хлопцаў, "сам ледзь вырваўся. Адзін паліцай папярэдзіў." Мароз звярнуўся па дапамогу да партызан, але тыя не змаглі ісці на выручку падлеткаў і спадзяваліся, што дзяцей адпусцяць. Аднак акупанты паставілі ўмову: гэта можа адбыцца, калі здасца іх настаўнік. Нягледзячы на жорсткую забарону камандзіра атрада, Мароз вяртаецца ў вёску таму, што не мог пакінуць сваіх вучняў адных у палоне, на здзек чужынцам, інакш ён здрадзіў бы самому сабе. Мароз згаджаецца з Ткачуком, што фашысты не выпусцяць юных мсціўцаў, што ісці здавацца ім — самагубства. Але ён цвёрда вырашае для сябе: трэба ісці. Дзеля людзей і будучыні Мароз пайшоў на верную смерць. У палоне, перад гібеллю, ён падбадзёрваў сваіх вучняў, стараўся быць спакойным і нават вясёлым, «казаў, што жыццё чалавечае надта несувымернае з вечнасцю і што ці пятнаццаць гадоў, ці шэсцьдзясят - усё не болей чымсьці імгненне ў вечнасці часу. Яшчэ казаў, што тысячы людзей хоць бы ў тым жа Сяльцы нарадзіліся і адышлі ў нябыт за вякі, і ніхто іх не ведае, не памятае. А вось іх будуць памятаць, і ўжо ў тым іхняя ўзнагарода. Найвялікшая з усіх магчымых у свеце ўзнагарод…» Тое, што з вучнямі ў іх апошні горкі час быў іх любімы настаўнік Алесь Іванавіч, аблегчыла іх маральны стан. Мароз да апошніх хвілін жыцця змагаецца за сваіх вучняў. Па дарозе на казнь дае надзею на выратаванне свайму выхаванцу Паўлу Міклашэвічу. Вельмі моцна параненаму хлопцу ўдалося выжыць насуперак бязлітаснаму ворагу. Такім чынам В. Быкаў сцвярджае перамогу высокай маральнасці настаўніка над крывадушнасцю і подласцю фашыстаў. Любоў да людзей, жывая дзейнасць настаўніка дае свой: Павел Міклашэвіч працягвае дзейнасць свайго настаўніка.

Высока ацэньвае ўчынак свайго героя і В. Быкаў: "Так, настаўнік Мароз не забіў ні аднаго немца і нават не ўдзельнічаў у дыверсіі школьнікаў на мосце. Але тым не менш ѐн здзейсніў подзвіг, значэнне якога цяжка пераацаніць… Наўрад ці патрабуе доказу, што Мароз у канчатковым выніку выхоўваў для подзвігу, фарміраваў свядомасць актыўных барацьбітоў, уласнай смерцю прадэманстраваў абсалютную непарыўнасць свайго слова і сваѐй справы. Вядома, ѐн вольны быў выбраць і іншы шлях, але выбраў менавіта такі, знешне малаэфектыўны і не вельмі знешне выніковы. Але хто можа кінуць у яго за гэта каменем?"

Прасачыўшы за лёсам Алеся Іванавіча Мароза, мы прыйшлі да высновы, што жыццѐ чалавека можа быць подзвігам, самаадданым служэннем людзям.

Тады гераізм праяўляецца звычайна вельмі сціпла, але ад таго не траціць сваѐй прыгажосці. Так жыў і Мароз, застаючыся да апошняй хвіліны высакародным, сумленным і адданым свайму абавязку, гераічная смерць стала вяршыняй яго жыццѐвага подзвігу

## ГЛАВА II ГЕРАІЧНАЕ ЗМАГАННЕ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ І ПРАФЕСІЙНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ П.М. МАШЭРАВА

### 2.1. Вытокі жыццялюбства і натхнёнасці П.М.Машэрава

П.М.Машэраў нарадзіўся 13 лютага 1918г. у в. Шыркі Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Бацькі яго былі сялянамі. Зямля, на якой размяшчалася вёска, была малаўрадлівай, каб пракарміць вялікую сям’ю, бацькі працавалі па 12-14 гадзін. Тата, Мірон Васільевіч, быў і цесляром, і слесарам, і сталяром, і апрацоўваў аўчыну, і шыў кажухі. Але ў сям’і панавалі падтрымка, згода і каханне. Дзяцінства Пятра, фарміраванне яго характару праходзіла ў самым спрыяльным асяроддзі. Станаўленне усёй сутнасці яго асобы абапіралася на трывалы падмурак сумленнай, працалюбівай сям’і беларускіх сялян. З самага дзяцінства яго прыцягвала вучэнне. У школу хлопчыку даводзілася хадзіць за 18 кіламетраў. Настаўнікі, заўважыўшы таленавітага вучня, дапамаглі яму развіць свой талент. Шмат разоў ён з’уляўся прызёрам раённых алімпіяд па матэматыцы, фізіцы. Здзіўляла і тое, што пры схільнасці да дакладных навук, ён вельмі любіў беларускую літаратуру, многія творы М.Багдановіча, Янкі Купалы, Цішкі Гартнага цытаваў па памяці. Пасля заканчэння сямігодкі ў в. Дворышча, куды давучвацца яго забраў старэйшы брат Павел, які на гэты час ужо знайшоў сваё прызнанне і стаў настаўнікам, Пётр паступае ў Віцебскі педінстытут на педагагічна-рабочы факультэт. У 1935г. юнак пераходзіць на фізіка-матэматычнае аддзяленне і ўступае ў камсамол. Тут па яго ініцыятыве былі створаны студэнцкі хор, музычні і танцавальны гурткі. Але ў 1937 г. з роднай вёскі Пятру Машэраву прыходзіць сумная вестка: па ілжывым даносе яго 55-ці гадовы бацька Мірон Васілевіч быў арыштаваны за антысавецкую прапаганду і сасланы ў Горкаўскую вобласць. Хворы на сэрца, ад цяжкай працы і складаных умоў жыцця, ён праз некалькі месяцаў там загінуў. Але сям’я даведалася пра гэта толькі пасля вайны. Рэабілітаваны Мірон Машэраў быў пасмяротна ў 1959г.

## 2.2. Настаўніцкая дзейнасць П.М.Машэрава

Аўдавеўшая маці Дар'я Пятроўна засталася ў Шырках, дзе яе пастаянна наведвае Пётр. У 1939 годзе, скончыўшы вучобу, Пётр накіроўваецца на працу ў в.Расоны выкладаць фізіку і матэматыку. Як некалі яго, падлетка, забраў да сябе брат, так цяпер Пётр едзе на месца новай працы, забраўшы з сабой маму і школьніц-сястрычак Вольгу і Надзею. Высокі, спартыўны 21-гадовы настаўнік на свой першы самастойны ўрок у IX клас ішоў як на свята. Апранаўся ён заўсёды з вялікім густам. Вопратка была сціплай, але сарочка да касцюма заўсёды была падабрана бездакорна, акуратная прычоска, шырокаплечая фігура прываблівалі увагу. Пазнаёміўшыся з вучнямі, якія былі ненамнога старэйшыя за яго, ён стаў з захапленнем расказваць пра прадмет, які павінен зрабіць сапраўдную рэвалюцыю ў народнай гаспадарцы. Для лепшага засваення ведаў прапанаваў абарудаваць кабінет фізікі. Школьнікі падтрымалі яго ідэю і уключыліся ў работу. Усе наглядныя пасобія, прыборы стваралася сваімі рукамі па плану, складзенаму Пятром Міронавічам. Удзельнічаў малады настаўнік і ў спартыўных спаборніцтвах па здачы норм ГТО. Па яго ініцыятыве самі выраблялі самыя прасцейшыя спартыўныя снарады, валейбольныя пляцоўкі, турнікі, арэлі. Многія вучні хадзілі на лыжах уласнай вытворчасці. Расоншчына – вельмі маляўнічы куточак Беларусі. Яе паўночную частку пакарываюць густыя пералескі і хваёвыя бары,вялікае возера Нешчарда і яшчэ большае Асвейскае. Яе паўднёвая частка мяжуе са старажытнай Полаччынай – культурнай і гістарычнай крыніцай беларусаў. Гэту выключную прыгажосць імкнуўся выкарыстаць П.М. Машэраў. Ён ствараў з вучняў самыя разнастайныя групы турыстаў і рабіў з імі рэгулярныя дальнія паходы для вывучэння роднага краю. Ні адзін урок, ні адно культурна-масавае мерапрыемства, якое праводзіў Машэраў, не былі падобны адзін да аднаго. Ён не абмяжоўваўся толькі работай па прадмеце, арганізаваў гурток астраноміі, дзе вучні вывучалі зоры, іх назвы і час іх адкрыцця, біяграфію Каперніка і іншых вучоных.

Пётр Машэраў вучыў дзяцей не толькі рашаць задачы па фізіцы іматэматыцы. Ён вучыў іх разважаць, усё рабіць з разуменнем, з цікавасцю. Школа была для го месцам, дзе яго неўтаймаваная энергія і трывалыя веды знаходзілі спрыяльную глебу і давалі дзіўную рунь. Настаўнік радаваўся поспехам сваіх вучняў і паведамляў: " За два гады ні адзін вучань не праваліўся нават пры конкурсах. Якія яны здольныя! Яны могуць авалодаць надта складанымі пытаннямі. Усім вучням цяжка давалася матэматыка, але нават тых, каму яна была найбольш складанай, можна навучыць. Я вёў матэматыку з 9-га класа, а калі б з 7-га? Якіх бы талентаў вырасціў!" Са сказанага можна пабачыць,што П.М.Машэраў і сам быў геніяльным настаўнікам. Толькі за два гады змог усяліць у душы школьнікаў упэўненасць у сваіх сілах, імкненне да ведаў, любоў да роднай зямлі, да Радзімы.

## 2.3.Выпрабаванне вайной

Шчаслівы час, калі можна было ствараць і клапаціцца пра развіццё талентаў скончылася імгненна. Прыйшоў час жорсткай барацьбы з лютым ворагам за выратаванне роднай Бацькаўшчыны.

Прызваць у армію Машэрава не паспелі, аднак ён запісаўся ў знішчальны батальён, з якім вымушаны быў адступаць на ўсход. Пад Невелем добра ўзброеныя танкавыя часткі расстралялі бяззбройных дабравольцаў, а тых, выжыў, захапілі ў палон. Палонных, а сярод іх быў і Машэраў, пасадзілі ў таварны вагон, які потым прычапілі да саставу, што рухаўся на захад. Рашэнне уцякаць Пётр Міронавіч прыняў імгненна, але яно было настолькі нерэальным, што не знайшло падтрымкі, усіх, хто знаходзіўся побач, але ў дапамозе яму сябры па няшчасцю не адмовілі. Агульнымі намаганнямі яны адчынілі акно-люк, праціснуўшыся праз якое Машэраў выцягнуўся уздоўж сцяны вагона і слізгануў па высокім насыпе пад адхон. Ён моцна пабіўся, але сур'ёзных траўм не было. У атабіяграфіі ім так апісаны гэты эпізод: " У Айчынную вайну быў каля ст. Пустошкі, папаў у палон 27.7 41года. Пры адпраўцы ў Германію 31.7.41 года ўцёк з цягніка не даязджаючы Вільна. " Праз некалькі дзён Машэраў ужо быў у Расонах.

Апынуўшыся ў родным пасёлку, Пётр Міронавіч уладкоўваецца рахункаводам у нераспушчаны фашыстамі калгас "Расоны" і працягвае выкладаць матэматыку і фізіку у мясцовай школе. Толькі галоўную ўвагу патрыятычна настроены малады чалавек скіроўвае на арганізацыю рэальнай сілы супрацьстаяння акупантам. У гэты час ім авалодала бязмерная прага помсты і ён гатовы быў пайсці нават на самаахвяраванне, але, адумаўшыся, ён прыйшоў да высновы, што супрацьстаяць ворагу павінна добра арганізаваная група. Ён ведаў, што на тэрыторыі раёна ёсць зброя, пакінутая часткамі Чырвонай Арміі, быў упэўнеы, што ў Расонах знойдзецц нямала патрыётаў і вёў таемныя перагаворы з калегамі, з моладдзю. Праз невялікі прамежак часу ён стварае падпольную групу, а потым баявы атрад імя Шчорса, куды увайшлі яго былыя і цяперашнія вучні, настаўнікі і аднавяскоўцы. Шуцкі В.П., былы вучань П.М.Мшэрава, стаў яго бліжэйшым памочнікам і камісарам партызанскага атрада. Народныя мсціўцы пускалі пад адхон цягнікі, якія ішлі на Усходні фронт, штурмавалі гітлераўскія гарнізоны, распаўсюджвалі зводкі Савінфармбюро, наладжвалі выратаванне палонных чырвонаармейцаў. Партызанскі атрад імя Шчорса паспяхова правёў дыверсійную аперацыю па знішчэнню стратэгічна важнага аб'екта - 72-х мятровага маста праз раку Дрыса. Дзякуючы дыверсіі быў спынеы рух варожых эшалонаў па дарозе Віцебск – Рыга. Фашысты аб'явілі сапраўднае паляванне на легендарнага камандзіра па мянушцы Дубняк (П. М. Машэраў). Калі схапіць героя фашысты не змаглі, арыштавалі маці Пятра Міронавіча Дар'ю Пятроўну і яго вучаніцу Г. Масальскую, жорстка здзекваліся з іх. Даведаўшыся пра арышт Дубняк-Машэраў рыхтуе масіраваны удар па Расонах і ў выніку ўдалай аперацыі выбівае фашыстаў з пасёлка, але на той момант жыхароў, звязаных з

партызанамі, расстралялі 9 верасня 1942г. Пётр Міронавіч доўга не мог прабачыць сабе, што не змог выратаваць маму. Партызанскі рух перарос ва ўсенароднае паўстанне і Машэраў становіцца камісарам партызанскай брыгады імя Ракасоўскага, праз некаторы час узначальвае Вілейскі падпольны абкам камсамола.

Указам 15 жніўня 1944г. Пятру Міронавічу Машэраву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, Ордэнам Леніна іЗалатой Зоркай за арганізацыю аднаго з першых на тэрыторыі Беларусі партызанскіх атрадаў.

# ГЛАВА III ЕДНАСЦЬ ЖЫЦЦЁВЫХ ПРЫНЦЫПАЎ АЛЕСЯ МАРОЗА З АПОВЕСЦІ В. БЫКАВА "АБЕЛІСК" І М.А. ПАШКЕВІЧА

Аповесць Васіля Быкава "Абеліск" мае прысвячэнне "Светлай памяці М. А. Пашкевіча". Свае творы пісьменнік прысвячаў толькі траім людзям: Рыгору Барадуліну, Уладзіміру Караткевічу і Міколу Пашкевічу. Гэта прысвячэнне стала першым з трох. Чаму ж яму, настаўніку Сваткаўскай школы Васіль Быкаў прысвяціў свой твор?

Мікола Арсеньевіч Пашкевіч нарадзіўся 20 мая 1936 года. Ён быў малодшым, сёмым, сынам у сям'і. Яго бацькі былі сялянамі вёскі Гарадзішча Вілейскага павета Віленскага ваяводства (цяпер — Мядзельскі раён Мінскай вобласці). Закончыў Халмоўскую пачатковую школу, затым вучыўся ў Сваткаўскай сярэдняй школе. Пасля школы служыў у Савецкай Арміі ў дэсантных вайсках. Потым паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які скончыў у 1963 годзе і пасля заканчэння 8 гадоў працаваў настаўнікам роднай мовы і літаратуры ў Сваткаўскай сярэдняй школе. Пісаў вершы, літаратуразнаўчыя артыкулы. У 1967 годзе паступіў у аспірантуру Інстытута літаратуры АН БССР, але па стане здароўя не змог яе скончыць і вярнуўся да працы ў школе.

У 1968 годзе выдаў кнігу «З вопыту работы літаратурнага гуртка…». У кнізе распавядаецца пра работу школьнага гуртка беларускай літаратуры «Маладая рунь», у пасяджэннях якога прымалі ўдзел беларускія пісьменнікі Янка Брыль, Васіль Быкаў, Уладзімір Караткевіч, Іван Навуменка, Максім Танк. Мікола Пашкевіч быў асабіста знаёмы з В. Быкавым. Іх сустрэча адбылася 29 красавіка 1971 г., калі пісьменнік наведаў Сваткаўскую школу Мядзельскага раѐна, дзе Мікола Пашкевіч працаваў настаўнікам роднай мовы і літаратуры, быў руплівым асветнікам у пашырэнні беларускай нацыянальнай культуры і мастацкай літаратуры, сам пісаў вершы. Настаўнік вельмі цаніў творчыя сустрэчы пісьменнікаў з вучнямі. Самай запамінальнай засталася сустрэча з Васілѐм Быкавым. Пісьменнік зазначыў, што вучні, выхаваныя Міколам Арсеньевічам, растуць чулымі да мастацкага слова, "дапытлівыя і цікаўныя да ведаў і найперш да ўсяго, што адносіцца роднай беларускай культуры". Мікола Арсеньевіч Пашкевіч, пазнаёміўшыся з аповесцю "Абеліск", даслаў аўтару наступны ліст, у якім выказаў свае адноіны да твора

"Мікола Пашкевіч – Васілю Быкаву. *Васіль Уладзіміравіч, добрага настрою і здароўя! Вось як цікава атрымоўваецца: думалася наведацца да вас летам – не атрымалася, меркавалі з Васілём Пятровічам Жуком зрабіць вам адзін душэўны сюрпрыз – выспяваем думку напісаць у "Настаўніцкую газету" пра* ***настольную кнігу кожнага настаўніка*** *– пра ваш "Абеліск" – і гэта мы апрадмецім у абавязковым парадку, калі ж толькі надрукуюць". "Ну і прывітанне ад нашых настаўнікаў. А вучні! Даражэнькі мой Васіль Уладзіміравіч, якога захаплення пра "Абеліск", мы чытаем трыма класамі пасля ўрокаў. Вось яны-то шлюць самыя чыстыя і самыя шчырыя, самыя непаддзельныя і самыя гарачыя словы найсардэчнасці і пажадання!"*

Тыя, хто асабіста ведаў Міколу Пашкевіча, успамінаюць, такі жыццёвы выпадак. Увёсцы Сваткі быў толькі адзін калодзеж. Настаўнік направіў прапанову пабудаваць водаправод, але яму адмовілі. Ён настойваў, даказваў неабходнасць для вёскі такой пабудовы. Толькі немагчыма было зрушыць з месца бюракратычную машыну. Тады ён сам рашыў гэтую праблему: на свае грошы зрабіў свідравіну. Да гэтага часу людзі карыстаюцца ёю. Можна заўважыць, што па сваіх жыццѐвых прынцыпах ѐн быў вельмі падобны да Алеся Іванавіча Мароза, галоўнага героя аповесці В. Быкава "Абеліск".

Памёр 14 сакавіка 1972 года пасля цяжкай хваробы. Дастойна і мужна паводзіў сябе ў час хваробы. Да апошніх хвілін казаў: "Я сёння бачу сонца, і дзякуй Богу". А ў канверце трымаў засушаную кветку васілька, якую спадзяваўся неяк перадаць на магілу Максіма Багдановіча. Яго сябар Васіль Жук атрымаў ад В.Быкава такі ліст. "Васіл Быкаў – Васілю Жуку. *Дарагі Васіль Пятровіч! Атрымаў Ваша невясёлае пасланне… Што зробіш! Вядома, цяпер такіх людзей мала, Мікалай Арсеньевіч сярод іх быў, мабыць, самы лепшы, самы самаадданы. Ну і вядома, лёс такіх заўжды самы трагічны. Відаць, тым, хто застаецца, трэба несці ў жыцці і іх частку. А несці трэба. Дай бог Вам здароўя! З павагай і сардэчнасцю В. Быкаў 25.III.72 г.* "

Пахаваны на могілках вёскі Гарадзішча. Скульптар Іван Міська на сабраныя настаўнікамі, вучнямі, сябрамі і блізкімі грошы стварыў помнік з бронзы. На помніку профіль настаўніка на барэльефе, а помнік нагадвае сонечны прамень.

ВЫСНОВЫ

Рэалізуючы пастаўленую мэту выявіць своеасаблівасць вобраза Алеся Мароза ў аповесці В. Быкава “Абеліск” і даследаваць дзеянні П.М.Машэрава ў час Вялікай Айчыннай вайны і М.А.Пашкевіча ў пасляваенны час, мы прыйшлі да наступных высноў.

Па-першае, Алесь Іванавіч Мароза, герой аповесці В. Быкава “Абеліск”, прадстае перад чытачом як носьбіт прынцыпаў народнай педагогікі, галоўныя з каторых – любоў да дзяцей, уздзеянне на асобу вучня ўласным прыкладам. З вышэй сказанага відаць, што ён чалавек справы, калі ўзнікаюць праблемы, імкнецца вырашаць іх самастойна, а не скардзіцца начальству ( рашае праблему нарыхтоўкі дроў). Ён не баіцца начальства, а трымаецца з годнасцю ( першая сустрэча з Ткачуком і іх размовы пра адукацыйны і выхаваўчы працэсы). З’яўляецца клапатлівым старэйшым сябрам сваім вучням, бярэ адказнасць за іх лёсы (абарона Паўла Міклашэвіча ад бацькі; клопат і душэўны боль за сясцёр-блізнятак Удовіных). Мароз выхоўваў, развіваў, узвышаў душы вучняў пры дапамозе кніг (чытанне рамана Л.Талстога). Вернасць прафесійнаму абавязку (працуе ў школе ў час акупацыі) Ён быў аўтарытэтам не толькі для дзяцей, але і для дарослых (нават паліцай Лаўчэня папярэджвае пра арышт). Абсалютна сумленны, верны свайму чалавечаму і настаўніцкаму абавязку ( не пакінуў сваіх вучняў адных у перадсмяротны час).

Па-другое, жыццяздольнасць вобраза Алеся Мароза ў аповесці В. Быкава “Абеліск” пацверджваецца існаваннем рэальных асоб з падобнымі лёсамі. П.М. Машэраў мае шэраг супадзенняў ў сваім лёсе з лёсам літаратурнага героя. Абодва настаўнікі

- працуюць на сваім месцы толькі 2 гады;
- клапоцяцца пра дабрабыт і паспяховасць вучняў праз стварэнне сваімі рукамі матэрыяльнай базы для навучання;
- лічаць, што ў першую чаргу павінны выхаваць чалавека;
- працягваюць працу ў школе і на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі;
- удзельнічаюць у партызанскім руху разам са сваімі вучнямі;
- выхавалі паслядоўнікаў сваёй справы.

Як і Алесь Мароз, настаўнік Сваткаўскай школы М.А.Пашкевіч быў руплівым асветнікам у пашырэнні культуры і мастацкай літаратуры. Нягледзячы на праблемы са здароўем, быў аптымістам і займаў актыўную жыццёвую пазіцыю. Педагагічная дзейнасць Мікалая Пашкевіча была кароткай — менш за восем гадоў. Але за гэты непрацяглы тэрмін зроблена шмат. Бясконцыя пошукі, клопат пра людзей, непасрэднасць, няўрымслівасць былі галоўнымі рысамі характару Міколы Пашкевіча, якія яднаюць яго з вобразам літаратурнага героя.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Васіль Быкаў. «Абеліск». ... Мн.: Ураджай, 1999. – 431с. – (Школьная бібліятэка). ... Проза Быкаў В. Сцяна. // Быкаў В. Выбранае.- Мн.,2001.- С.403-414.Бугаёў Д. “Васіль Быкаў. Нарысы жыцця і творчасці” Мн. “Народная асвета”, 1987
2. Антонович, С. В. Петр Машеров : документальная повесть / С. В. Антонович. – Минск. : Веснік, 1993. – 288 с.
3. Марціновіч А., Мн., “Народная асвета” Шляхам праўды: Выбраныя старонкі беларускай літаратуры ў святле сённяшняга дня: Літаратурна — крытычныя артыкулы: Дапаможнік для настаўніка. — Мн.: Народная асвета, 1994. — 288 с. — ISBN 985-03-0105-8.
4. “Сын белорусского народа Пётр Машеров. К 95-летию со дня рождения. Воспоминания и статьи / Руководитель проекта С.Л.Кандыбович; Сост. Н.И. Чехлов; сост. науч. аппарата С.Л. Кандыбович, О.В. Солопова, М.Г. Бобенко. — М.: НО Ассоциация «Лига содействия оборонным предприятиям»., 2013. — 2000 экз. — ISBN 978-5-904540-13-5.”
5. Якутов В. “ Пётр Машеров” Мн. “Белая Русь”, 1992
6. “Сваю я людзям цеплыню аддам і сэрцам, і душой” Крыніца: https://narachanka.by/shkolnaye-zhyccyo/svayu-ya-lyudzyam-cyeplynyu-addam-i-sercam-i-dushoy/
7. Сяргей Шапран. «Лёс такіх заўжды самы трагічны»: Выбранае з перапіскі Васіля Быкава і Міколы Пашкевіча // Роднае слова. — 2011. — № 6 (282). — С. 7.